УДК 94(476)

**І. А. Андарала**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# СТАН ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ Ў ГОД ВЫЗВАЛЕННЯ РЭСПУБЛІКІ АД НЯМЕЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

У артыкуле на аснове вывучэння архіўных матэрыялаў даецца характарыстыка стану школьнай адукацыі рэспублікі напярэдадні канчатковага вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Разглядаюцца ўмовы і цяжкасці, якія суправаджалі аднаўленне сеткі школ, іх матэрыяльна-тэхнічнай базы, арганізацыю вучэбнага працэсу, закранаецца праблема забеспячэння школ настаўніцкімі кадрамі.

**Ключавыя словы:** адукацыя, школа, матэрыяльная база, вучэбны працэс, педагагічныя кадры.

**I. A. Andarala**
Belarusian State Technological University

# STATE OF SCHOOL EDUCATION OF BELARUS IN THE YEAR OF LIBERATION OF THE REPUBLIC FROM GERMAN CAPTURES

Based on the study of archival materials, the article describes the state of school education in the republic just before the final liberation of the republic from the Nazi invaders. We consider the conditions and difficulties that accompanied the renewal of the network of schools, their material and technical base, the organization of the educational process, and the problem of providing schools with teaching staff.

**Key words:** education, school, material base, educational process, teaching staff.

**Уводзіны.** У гэтым годзе Беларусь адзначыла 75-ю гадавіну з дня канчатковага вызвалення сваёй тэрыторыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Каб у поўнай меры ацаніць поспехі, дасягнутыя нашай краінай за гэты гістарычны перыяд, неабходна вярнуцца ў тыя далёкія 1940-я гады, калі пачыналася і адбывалася пасляакупацыйнае аднаўленне фактычна поўнасцю разбуранай народнай гаспадаркі і сацыякультурнай сферы. Сказанае ў поўнай меры адносіцца і да сістэмы школьнай адукацыі рэспублікі, якая сёння аб'ядноўвае 3067 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з кантынгентам 994,5 тысячы навучэнцаў.

Трэба адзначыць, што працэс пасляакупацыйнага аднаўлення школьнай адукацыі і яе стан напярэдадні поўнага вызвалення рэспублікі ад нямецкіх захопнікаў у пэўнай ступені знайшоў сваё асвятленне ў юбілейных нарысах, прысвечаных развіццю народнай адукацыі БССР за гады савецкай улады. Яны належалі пяру кіраўнікоў асветы рэспублікі І. М. Ільюшыну [1], П. В. Саевічу [2], С. А. Умрэйку [3] і былі напісаны з мэтай прапаганды поспехаў агульнаадукацыйнай школы. Гэтыя працы пранікнуты палітычнымі ідэямі, якія ў гатовай форме спускаліся «зверху» і не падлягалі крытыцы. Аўтары асноўную ўвагу засяроджваюць на адлюстраванні дзейнасці партыйных арганізацый і ўладных структур па кіраўніцтве агульнаадукацыйнай школай. У публікацыях прыводзяцца самыя агульныя звесткі аб пасляакупацыйным аднаўленні і развіцці школьнай адукацыі: колькасць школ, навучэнцаў у іх, поспехі ў ажыццяўленні ўсенавуча, аб'ём сродкаў, выдзеленых на развіццё школьнай адукацыі. Фактычны матэрыял падаецца ў мажорным тоне, без глыбокага аналізу, тэарэтычных абагульненняў і высноў.

**Асноўная частка.** За передваеннае дзесяцігоддзе ў Беларусі была створана і паспяхова функцыянавала дастаткова разгалінаваная сістэма агульнай сярэдняй адукацыі. Яна ўключала тры тыпы агульнаадукацыйных школ: пачатковую школу – 4 гады навучання, няпоўную сярэднюю – 7 гадоў і сярэднюю – 10 гадоў. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, у 1940/41 навучальным годзе, сетка школьнай адукацыі, якая пашырылася ў 1939 годзе за кошт школ далучаных да рэспублікі заходніх абласцей, налічвала 13 043 школы. З іх пачатковых – 9229; сямігадовых – 2841; сярэдніх – 973. Ва ўсіх тыпах школ навучалася 1 826 129 вучняў. У I–IV класах – 1 281 363; V–VII – 455 847; VIII–X – 88 919 чалавек. Школы мелі адносна добрую матэрыяльную базу: былі забяспечаны школьнай мэбляй, абсталяванымі спецыяльнымі кабінетамі, вучэбна-нагляднымі дапаможнікамі, пры кожнай школе функцыянавала бібліятэка з кніжнымі фондамі ад 500 (у пачатковай школе) да 5000 кніг (у сярэдняй школе). Навучальны працэс у школах забяспечвалі 60 724 настаўнікі, большасць з якіх мела сярэднюю і вышэйшую педагагічную адукацыю [4, л. 186].

У выніку вайны і за гады жорсткай акупацыі сістэма школьнай адукацыі рэспублікі панесла вялікія матэрыяльныя і кадравыя страты. Так, у Мінскай вобласці з працаваўшых да пачатку вайны 1621 школы 771 была ўзарвана або спалена, астатнія разбураны, знішчана ўсё гаспадарчае і вучэбнае абсталяванне школ, падручнікі і наглядныя

дапаможнікі. У Бягомльскім раёне гэтай вобласці нямецкія акупанты поўнасцю знішчылі ўсе 84 школьныя будынкі, у Плешчаніцкім раёне – 54 будынкі з 61 [5, л. 167].

У Гомельскай вобласці з 846 будынкаў школ было знішчана 508, спалена 70 тысяч парт, 37 тысяч класных дошак, абсталяванне 177 хімічных і фізічных кабінетаў, 1,5 мільёна тамоў вучэбнай і мастацкай літаратуры [6, л. 62].

У Палескай вобласці з 1003 школ, якія функцыянавалі перад пачаткам вайны, былі спалены і разбураны 604. Школьныя будынкі, якія ўцалелі, знаходзіліся ў паўразбураным стане – адсутнічалі падлогі, вокны, дзверы. Абсталяванне школ, бібліятэкі, вучэбна-наглядныя дапаможнікі, падручнікі былі знішчаны. У Лельчыцкім і Капаткевіцкім раёнах вобласці наогул не ўцалела ні адна школа [7, л. 279].

Падобная сітуацыя назіралася і ў іншых абласцях. У цэлым па рэспубліцы было поўнасцю спалена і разбурана 6808 будынкаў школ, або больш за 50% даваеннай колькасці [4, л. 184]. Уцалелыя будынкі патрабавалі істотнага рамонту, неабходна было поўнасцю ўзнавіць школьную маёмасць, абсталяванне кабінетаў, бібліятэкі, падручнікі.

Акрамя матэрыяльнага, агульнаадукацыйнай школе рэспублікі быў нанесены істотны кадравы ўрон. Многія з настаўнікаў, якія знаходзіліся на акупіраванай тэрыторыі, былі расстраляны, павешаны, вывезены на працу ў Германію. Аб маштабах рэпрэсій у дачыненні да настаўнікаў яскрава сведчыць той факт, што толькі ў Баранавіцкай вобласці фашысты знішчылі 248 настаўнікаў і 83 вывезлі ў Германію [7, л. 12]. У Скідзельскім раёне ад рук захопнікаў загінула 50 настаўнікаў [6, л. 94].

Да аднаўлення фактычна поўнасцю разбуранай школьнай гаспадаркі рэспубліка прыступіла ўжо восенню 1943 года, калі толькі пачалося вызваленне ўсходніх раёнаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а на большай частцы тэрыторыі вяліся актыўныя баявыя дзеянні. Партыйным і савецкім кіраўніцтвам краіны і рэспублікі аднаўленне школьнага навучання разглядалася як неад’емная ўмова нармалізацыі ўсяго жыцця на вызваленай тэрыторыі і як стратэгічная задача ідэалагічнага, гаспадарчага і абароннага значэння. Аб гэтым сведчыць прынятая 1 студзеня 1944 года сакрэтная пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах Саўнаркома БССР і ЦК КП(б)Б», якая абавязвала партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі «аднавіць у 1944 годзе ў вызваленых раёнах сетку пачатковых і сярэдніх школ, ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту» [8, с. 37].

Першымі аднаўляць дзейнасць агульнаадукацыйных школ пачалі вызваленыя раёны Палескай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Перад партыйна-савецкім кіраўніцтвам і аддзеламі народнай адукацыі гэтых абласцей і вызваленых раёнаў была пастаўлена задача правесці ўлік дзяцей школьнага ўзросту, аператыўна адрамантаваць школьныя будынкі і прыстасаваныя для іх памяшканні, укамплектаваць школы педагагічнымі кадрамі і неадкладна пачаць вучэбныя заняткі.

Магілёўскі абласны аддзел народнай адукацыі пачаў сваю дзейнасць па арганізацыі школьнага навучання ўжо ў кастрычніку 1943 года, калі было поўнасцю вызвалена толькі 8 раёнаў вобласці [6, л. 2].

У Гомельскай вобласці першымі аднавілі сваю дзейнасць школы Добрушскага, Цэрахаўскага і Свяцілавіцкага раёнаў. На 15 лістапада 1943 года ў Добрушскім раёне працавала 11 пачатковых школ з кантынгентам навучэнцаў 1639 чалавек, Цэрахаўскім раёне – 15 школ (13 пачатковых і 2 няпоўныя сярэднія школы), у Свяцілавіцкім раёне – 10 пачатковых школ [9, л. 43].

У Палескай вобласці падрыхтоўка да школьнага навучання пачалася ў лістападзе 1943 года [3, л. 20]. Праз два месяцы, у снежні 1943 года, заняткі пачаліся ў школах Брагінскага, Камарынскага і Хойніцкага раёнаў [6, л. 34].

Па меры вызвалення тэрыторыі ад нямецкіх захопнікаў да аднаўлення школьнай адукацыі неадкладна прыступалі іншыя вобласці рэспублікі. Так, Бражэзаўская і Пушкоўская школы Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці пачалі сваю дзейнасць ужо на другі дзень пасля выгнання захопнікаў [6, л. 11].

Галоўнай праблемай, якая стрымлівала аднаўленне школьнага навучання ў першыя пасляакупацыйныя месяцы, была фактычна поўная адсутнасць школьных памяшканняў. Яе рашэнне ўскладнялася па прычыне інтэнсіўных работ, якія вяліся на вызваленай тэрыторыі рэспублікі, па адбудове прамысловых аб’ектаў, сельскай гаспадаркі, транспарту, што патрабавала значных матэрыяльных, людскіх і фінансавых рэсурсаў. Як следства, цяжар работ па будаўніцтве і рамонце школьных памяшканняў лажыўся на плечы настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў, якія прыкладалі вялікія намаганні, каб забяспечыць мінімальныя ўмовы для арганізацыі вучэбных заняткаў. Яны рамантавалі, абсталёўвалі, бялілі школьныя памяшканні, збіралі падручнікі, выраблялі мэблю, нарыхтоўвалі дровы. Пэўную дапамогу ў аднаўленні школьнага фонду аказвалі вайсковыя фарміраванні. Напрыклад, у Чавускім раёне вайскоўцы пабудавалі для школы будынак на шэсць пакояў [6, л. 48].

У гарадской мясцовасці аднаўленне школьнай адукацыі стрымлівалася яшчэ і па прычыне таго, што ўцалелыя будынкі школ былі заняты дзяржаўнымі арганізацыямі, установамі, шпіталямі, ваеннымі часцямі. Спробы органаў адукацыі вярнуць памяшканні для выкарыстання па прызначэнні натыкаліся на супраціўленне тых структур, якія ў іх размяшчаліся. Працэс вяртання

школьным установам памяшканняў, якія ім належалі, палепшыўся толькі пасля прыняцця 5 сакавіка 1944 года пастановы СНК СССР «Аб парадку вяртання школьных памяшканняў, якія выкарыстоўваюцца не па прызначэнні».

Улічваючы становішча рэспублікі з аднаўленнем школьнага фонду, СНК СССР у складаных умовах ваеннага часу, згодна са сваёй пастановай ад 18 лютага 1944 года, выдаткаваў НКА БССР на правядзенне ў 1944 годзе капітальных работ па аднаўленні школьнай гаспадаркі 15 мільёнаў рублёў [10, л. 7], а ў красавіку гэтага ж года дадаткова яшчэ 5 мільёнаў рублёў на аднаўленне школьнай адукацыі ў Палескай, Гомельскай і Віцебскай абласцях [10, л. 30].

Намаганнямі мясцовых уладаў, раённых аддзелаў народнай адукацыі, грамадскасці да вясны 1944 года на вызваленай тэрыторыі рэспублікі ўдалося часткова аднавіць сетку агульнаадукацыйных навучальных устаноў і пачаць у іх вучэбныя заняткі. Але ў цэлым, як адзначалася ў загадзе народнага камісара асветы рэспублікі Е. І. Уралавай ад 8 сакавіка 1944 года «Аб ходзе аднаўлення школ у вызваленых раёнах БССР», у гэтай справе меліся істотныя недахопы [11, л. 168]. Па прычыне адсутнасці будаўнічых матэрыялаў, кваліфікаванай працоўнай сілы і транспарту капітальныя работы па школьным будаўніцтве ў рэспубліцы, нягледзячы на наяўнасць фінансавых сродкаў, не былі распачаты. Будаўнічыя работы вяліся толькі гаспадарчым спосабам і ў нязначным аб'ёме [4, л. 315].

Яшчэ адным стрымліваючым фактарам аднаўлення школьнай адукацыі быў дэфіцыт настаўніцкіх кадраў. Для забеспячэння вучэбнага працэсу ў школах, якія распачалі сваю дзейнасць на вызваленай тэрыторыі рэспублікі ў 1943/44 навучальным годзе, патрабавалася 12 329 чалавек, а ў наяўнасці было толькі 7513 настаўнікаў [12, л. 6]. Найбольш востра гэта праблема адчувалася ў заходніх абласцях рэспублікі. Так, у Палескай вобласці не хапала 1030 настаўнікаў [12, л. 4]. З прычыны іх адсутнасці ў вобласці не працавала 60 школ [13, л. 25].

Тым не менш, нягледзячы на ўсе складанасці, да канца 1943/44 навучальнага года ў вызваленых раёнах рэспублікі ўдалося аднавіць работу значнай колькасці школ і арганізаваць у іх вучэбныя працэсы для большай часткі дзяцей школьнага ўзросту.

Так, у чэрвені 1944 года ў вызваленых раёнах Магілёўскай вобласці працавалі 432 пачатковыя школы, 85 няпоўных сярэдніх і 16 сярэдніх школ. З іх 168 пачатковых школ размяшчаліся ў прыстасаваных будынках, у тым ліку зямлянках. Вучобай было ахоплена 53 626 чалавек: у I–IV класах – 42 030, у V–VII класах – 10 380 і ў VIII–X класах – 1216 вучняў. На жаль, 4465 дзяцей школьнага ўзросту так і засталіся неахопленымі вучобай у школе. У асноўным гэта былі жыхары спаленых вёсак, а таксама тыя, хто не мог наведваць школу па прычыне адсутнасці вопраткі і абутку [6, л. 48].

У Палескай вобласці на канец 1943/44 навучальнага года аднавілі дзейнасць 332 школы. З іх: пачатковых – 268, сямігадовых – 58, сярэдніх – 6. Агульная колькасць навучэнцаў у іх складала 31 051 чалавек з 43 849 дзяцей школьнага ўзросту, якія падлягалі абавязковаму навучанню. Па розных прычынах (адсутнасць школьных памяшканняў, настаўнікаў, вопраткі і абутку ў дзяцей і інш.) 12 798 чалавек, або 29% ад агульнай колькасці дзяцей школьнага ўзросту, не наведвалі школу [6, л. 33].

У цэлым па рэспубліцы, па данных наркамасветы, у канцы 1943/44 навучальнага года ў рэспубліцы працавала 1458 школ з агульнай колькасцю навучэнцаў 147 092 чалавекі, у тым ліку 1146 пачатковых – з кантынгентам навучэнцаў 122 271 чалавек, 267 сямігадовых – 22 798 чалавек і 45 сярэдніх – 2489 чалавек [4, л. 325].

Пры аднаўленні сеткі школ у першы пасляакупацыйны год органы народнай адукацыі на месцах зыходзілі галоўным чынам з неабходнасці арганізацыі работы пачатковых школ для дзяцей 8–13 гадовага ўзросту. Таму большасць (78%) аднавіўшых да канца 1943/44 навучальным года школ складалі сельскія пачатковыя школы. Яны, як правіла, размяшчаліся ў часткова адрамантаваных або прыстасаваных памяшканнях, у сялянскіх хатах, а часам нават у зямлянках і бліндажах. Прыстасаваныя для школ памяшканні не адпавядалі элементарным патрабаванням школьнай гігіены, мелі нязначныя памеры, земляныя падлогі, дрэннае асвятленне. Заняткі праводзіліся без вучэбных планаў, вучэбных праграм, падручнікаў, пісьмовых прыналежнасцяў. Напрыклад, у школах Магілёўскай вобласці кожны вучань малодшых класаў атрымаў на вучэбны год 2 сшыткі, старшых класаў – 4 сшыткі [6, л. 49]. Сур'ёзнай праблемай з'яўлялася дрэннае ацяпленне школьных памяшканняў. У зімовы перыяд у школах было холадна і вучням даводзілася вучыцца ў верхнім адзенні. Многія школы па прычыне адсутнасці дроў вымушаны былі нават прыпыніць вучэбныя заняткі.

Паколькі школьныя ўстановы аднаўлялі сваю дзейнасць па меры вызвалення тэрыторыі рэспублікі, то ў многіх раёнах вучэбны год пачаўся значна пазней за верасень. Як правіла, у гэтых школах новы праграмны вучэбны матэрыял не вывучаўся. На ўроках паўтаралася тое, што вывучалася ў даваенныя гады. У выніку, з агульнай колькасці працаваўшых у 1943/44 навучальным годзе школ праграмны матэрыял па вучэбных дысцыплінах быў засвоены толькі ў 586 школах [4, л. 327]. Іспыты, што праводзіліся вясной 1944 года ў школах Брагінскага, Камарынскага і Хойніцкага раёнаў, паказалі, што ва ўмовах адсутнасці падручнікаў, вучэбна-наглядных дапаможнікаў, нізкай кваліфікацыі настаўнікаў засвоіць праграмны матэрыял на належным узроўні школьнікам

не ўдалося. Па гэтай прычыне іспыты ў многіх школах былі адменены [6, л. 35].

**Заключэнне.** Ні ў якім разе не падвяргаючы сумненню маштабнасць і значнасць працы, праведзенай у рэспубліцы ў першы пасляакупацыйны год па аднаўленні школьнай адукацыі, трэба адзначыць, што да заканчэння 1943/44 навучальнага года пытанні аднаўлення школьнай гаспадаркі, ахопу навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту, забеспячэння школ педагагічнымі кадрамі так і засталіся нявырашанымі. Большасць сельскіх пачатковых школ працягвала размяшчацца ў неадрамантаваных і непрыстасаваных памяшканнях. Адсутнасць матэрыялаў і вытворчай базы не дазволілі арганізаваць, як планавалася, выданне падручнікаў, выраб школьнай мэблі і пісьмовых прылад. 20 965 дзяцей школьнага ўзросту на канец навучальнага года так і не прыступілі да вучобы [4, л. 326]. Значная колькасць школ на вызваленай тэрыторыі не змагла аднавіць сваю работу па прычыне адсутнасці настаўніцкіх кадраў.

## Літаратура

1. Ільюшын І. М., Умрэйка С.А. Народная асвета ў Беларускай ССР. Мінск: Вуч.-пед. выд-ва МА БССР, 1957. 357 с.
2. Саевич П. В. Народное образование БССР за 30 лет. Минск: Госиздат БССР, 1948. 47 с.
3. Умрэйка С. А. 30 год савецкай школы ў БССР // Савецкая школа. 1949. № 1. С. 3–11.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 21.
5. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 30.
6. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 29.
7. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 34.
8. Освобожденная Беларусь. Документы и материалы. В 2 кн. Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944 / сост.: В. И. Адамушко [и др.]. Мінск, 2004. С. 34–39.
9. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 27.
10. НАРБ. Ф. 42. Воп. 6. Спр.1.
11. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 32.
12. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 22.
13. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 17. Спр. 28.

## References

1. Il'yushin I. M., Umreyka S. A. *Narodnaya asveta u Belaruskay SSR* [National education in Belarusian SSR]. Minsk, Vuch.-ped. vyd-va MA BSSR Publ., 1957. 357 p.
2. Sayevich P. V. *Narodnoye obrazovaniye BSSR za 30 let* [National education of BSSR for 30 years]. Minsk, Gosizdat BSSR Publ., 1948. 47 p.
3. Umreyka S. A. 30 years of soviet school in BSSR. *Savetskay shkola* [Soviet school], 1949, no. 1, pp. 3–11 (In Belarusian).
4. National Archives of Republic of Belarus (NARB). Fund 4п. I. 17. F. 21.
5. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 30.
6. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 29.
7. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 34.
8. *Osvobozhdenaya Belarus'. Dokumenty i materialy. V 2 kn. Kn. 1. Sentyabr' 1943 – dekabr' 1944* [Liberated Belarus. Documents and materials. In 2 books. Book 1. September 1943 – December 1944]. Comp.: V. Adamushko [et al.]. Minsk, 2004. Pp. 34–39.
9. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 27.
10. NARB. Fund 4п. I. 6. F. 1.
11. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 32.
12. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 22.
13. NARB. Fund 4п. I. 17. F. 28.

## Інфармацыя пра аўтара

**Андарала Ігар Аляксандравіч** – кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: aia77@mail.ru

## Information about the author

**Andarala Igar Alexandrovich** – PhD (Pedagogics), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic Belarus) E-mail: aia77@mail.ru

*Паступіў 09.09.2019*